ряда историко-культурных объектов. К 500–летию белорусского книгопечатания изданы все книги Библии Ф. Скорины, были переизданы факсимильным способом Слуцкое и Полоцкое евангелии и другие раритеты.

УДК Б 930

## Цэнзура як сродак ажыццяўлення ідэалагічнай палітыкі расійскага самадзяржаўя

Багдановіч А.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Цэнзура ў Расійскай імперыі з’яўлялася важным рычагом правядзення палітыкі самадзяржаўя ў галіне ідэалогіі не толькі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, але і ў межах ўсёй краіны. У прапануемым даследаванні мы паставілі мэту прасачаць асноўныя этапы развіцця цэнзуры ў імператарскай Расіі і паказаць, што яна, сапраўды, з’яўляяся адным з найважнейшых сродкаў ажыццяўлення ідэалагічнай палітыкі самадзяржаўя.

З канца XVIII ст. па 1917 г. ў расійскай цэнзуры склаліся пэўныя традыцыі, былі выпрацаваны розныя яе віды і формы, накіраваныя на ахову асноў дзяржавы і яе інстытутаў, абмежаванне свабоды слова і доступу да рознага роду інфармацыі, пераслед іншадумства і г. д. Шматлікія Рэвалюцыі на захадзе аказалі моцны ўплыў на цэнзурную палітыку, кінуўшы ўсе сілы і сродкі на «супакаенне мяцежнага духу» Польшчы і беларускіх губерняў, улады спрабавалі цэнзурнымі мерамі спыніць распаўсюджанне антыўрадавых ідэй.

Па патрабаванні III аддзялення, цэнзарам неаднаразова нагадвалася аб абавязку даводзіць да ведама «вышэйшага начальства», калі на цензураванне будзе прадстаўлена сачыненне «парушальніка абавязку вернападданага». Асобая ўвага цэнзуры, было звернута на перыядычны друк, бо прэса аператыўна перадавала разнастайную інфармацыю і распаўсюджвалася сярод шырокага кола асоб.

Прызнаючы небяспеку «разбуральнага заходняга ўплыву», урад спрабаваў захаваць ад яго грамадзян сваёй краіны. Перш за ўсё ён імкнуўся да недапушчэння крытычных думак у адносінах да інстытута самадзяржаўя. Дадзены цэнзурны кірунак у стаўленні да замежнай літаратуры ўпершыню ярка выявіўся на фоне шматлікіх еўрапейскіх рэвалюцый XVIII–XIX стагоддзў, калі Расія «з двойчы ўзросшым стараннем стала ўзводзіць плот вакол імперыі», асцерагаючыся, што ліберальныя ідэі знойдуць адбітак у сэрцах людзей – найвялікая ўвага пры гэтым надавалася айчыннай перыёдыцы, здольнай гэтыя ідэі данесці да радавога чытача простай і зразумелай мовай. Але рускі імперскі рэжым

праваліў сваю місію, бо высвятлілася, што плот, збудаваны вакол імперыі, не змог абараніць краіну ад сапраўды небяспечных ідэй і прывеў яе імперыю да гібелі.

УДК329(476)

## Краёвая ідэалогія ў беларускім нацыянальным руху

Багалейша С.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Важным этапам у развіцці беларускага нацыянальнага руху і змяненні яго ідэалогіі стала рэвалюцыя 1905-1907 гг. Пад яе ўплывам ён пачаў пераўтварацца ў істотны фактар грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларуска-Літоўскага краю. Сфарміравалася ідэя палітычнай нацыі, якая была непарыўна звязана з краёвай ідэалогіяй. Яе з'яўленне ў грамадска-палітычным жыцці было выклікана абвастрэннем этнічных і сацыяльных адносін у Расійскай імперыі. Выпрацоўка асноўных палажэнняў краёвай ідэалогіі закончылася вясной 1906 г. Праіснавалі ідэі краёвасці да 1920-1921 гг. і былі перакрэслена ўмовамі Рыжскага міру 1921 г. і ўтварэннем «Сярэдняй Літвы» 1920 г.

Ідэалогія краёвасці мела гістарычны падмурак і грунтавалася на гістарычнай памяці пра прыналежнасць беларускіх і літоўскіх зямель да ВКЛ. Сцвярджаючы агульнасць гістарычнага лёсу ўсіх народаў былога ВКЛ, яны лічылі неабходным захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці „гістарычнай Літвы». У перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. краёўцы выступалі за аўтаномію Беларуска-Літоўскага краю з сеймам у Вільні. Першым, хто сфармуляваў асноўную ідэю краёвай ідэалогіі быў Раман Скірмунт. «Усе жыхары беларуска-літоўскага краю незалежна ад этнічнай прыналежнасці і сацыяльнага паходжання павінны аб'яднацца ў сумеснай працы на карысць усяго краю і ўсіх яго народаў» – сцвярджаў ён.

Краёвая ідэалогія нарадзілася ў асяроддзі ліцвінскай шляхты, прадстаўнікі якой зачастую адчувалі сваю прыналежнасць адначасова да розных этнасаў. Сярод яе прапагандыстаў у розныя гады былі Раман Скірмунт, Канстанцін Скірмунт, Міхал Ромер, Людвік Абрамовіч, браты Антон і Іван Луцкевічы і інш. Але кожны з іх па рознаму разумеў краёвасць. Гісторыкі звычайна выдзяляюць у краёвай ідэалогіі два накірункі: кансерватыўны і дэмакратычны (або ліберальна-дэмакратычны). У краёвай ідэалогіі тэрмін «нацыя» выйшаў за межы этнічнага разумення і набыў палітычны змест. Галоўнай прыкметай нацыі стала агульнае грамадзянства. Да «нацыі ліцвінаў» адносілі палякаў, літоўцаў, беларусаў і інш., т.зв. «карэнныя» этнасы краю. Этнічнае паходжанне і культурная прыналежнасць адыгрывалі другарадную ролю. У сваёй практычнай дзейнасці краёўцы прызнавалі роўнасць палякаў,